# АДЛЮСТРАВАННЕ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 ГГ. У ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКУ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І РОЛЯ ЯГО ВЫВУЧЭННЯ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ВУЧНЯЎ

Я. В. Абрамчук, А. А. Корзюк, г. Мінск

Вывучэнне тэмы “Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі” дае магчымасць вучням 9-га класа ўсвядоміць працэс нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа ў другой палове XIX ст. супраць памешчыцкага прыгнёту і мае шырокі патэнцыял для выхавання іх грамадзянска-патрыятычных пачуццяў і нацыянальнай самасвядомасці. Тэкст параграфа ў вучэбным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 9 класа [1] дазваляе вучням цэласна ўявіць перадумовы паўстання, падрыхтоўку да яго, разглядзець яго пачатак, ход і падаўленне. У яго змесце таксама адлюстраваны ўплыў паўстання на ўмовы вызвалення сялян беларускіх губерняў. У цэлым, змест параграфа цалкам адвавядае вучэбнай праграме [2, с. 53].

У самым пачатку параграфа аўтары вучэбнага дапаможніка прапаноўваюць вучням успомніць мэты і склад удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. для далейшага параўнання з паўстаннем 1863–1864 гг. і актуалізацыі раней засвоенных ведаў. Адразу ж у першым пункце даецца інфармацыя аб складзе ўдзельнікаў і іх мэтах. Далей адлюстраваны перадумовы паўстання, характарыстыка дзейнасці Цэнтральнага нацыянальнага (ЦНК) і Літоўскага правінцыяльнага камітэтаў (ЛПК). На нашу думку, біяграфіі К. Каліноўскага як аднаго з лідараў паўстання, не надаецца дастатковай увагі. Тым не менш, станоўчую ролю для вобразнага ўяўлення постаці змагара адыгрывае ўспамін аднаго з удзельнікаў паўстання, дзе ён выступае як высокародны, адукаваны чалавек, самаадданы патрыёт сваёй Бацькаўшчыны. Яскравым прыкладам барацьбы Каліноўскага з’яўляецца выданне ім разам з паплечнікамі газеты “Мужыцкая праўда”, якая падымала баявы дух беларускага сялянства. Прыведзены ўрывак тэксту аднаго з нумароў газеты дазваляе вучням адчуць атмасферу таго часу, паспачуваць беларускаму сялянству як адданаму барацьбіту за сваю свабоду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры апісанні пачатку і ходу паўстання раскрываецца праграма паўстанцаў. Гэта дазваляе вучням прасачыць мэты паўстання, абудзіць у іх гонар за сваіх продкаў. Прыведзены даныя аб сацыяльным складзе ўдзельнікаў і метадах іх барацьбы, называюцца буйнейшыя бітвы і асобы, якія вызначыліся ў барацьбе за г. Горкі, мястэчка Мілавіды Слонімскага павету. У змесце параграфа распавядаецца пра падаўленне паўстання генерал-губернатарам М.М. Мураўёвым і жорсткія меры царскіх улад, якія прымяняліся ў дачыненні да ўдзельнікаў паўстання. Вялікай стратай для барацьбітоў стаў арышт і пакаранне смерцю К. Каліноўскага, які за гады паўстання праявіў сябе не толькі як змагар за свабоду народа, але і як таленавіты паэт, што пакінуў у скарбонцы беларускай культуры выдатныя літаратурныя помнікі – верш “Марыська чарнаброва, галубка мая” і “Пісьмы з-пад шыбеніцы”. У тэксце параграфа прыводзіцца урывак з “Пісьмаў…”, які ўяўляе сабой духоўны запавет Каліноўскага беларускаму народу. У змесце пункта таксама прыводзяцца статыстычныя дадзеныя ахвяр падаўленага паўстання, якія можна выкарыстаць для

параўнання з паўстаннем 1830–1831 гг. На падставе разгледжанага матэрыялу фармуліруецца важная выснова аб тым, што справа паўстання не прайшла бясследна: яно будзіла да барацьбы за свабоду наступныя пакаленні.

Тэкст параграфа насычаны ілюстрацыямі, якія ствараюць умовы для візуальнага ўспрымання вучнямі гістарычнай інфармацыі. Так, змешчаны партрэт К. Каліноўскага, рэпрадукцыі карцін П. Сергіевіча “К. Каліноўскі сярод паўстанцаў” і К. Альхімовіча “На этапе”, фотаздымак аднаго з нумароў “Мужыцкай праўды”, партрэт віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва. Дадзеная нагляднасць з’яўляецца незамянняльным сродкам стварэння ў школьнікаў выразных і гістарычна праўдзівых уяўленняў пра вывучаемую гістарычную падзею. Асноўны тэкст параграфа суправаджаецца гістарычнымі дакументамі, якія можна выкарыстаць з мэтай азнаямлення вучняў гістарычнымі помнікамі як крыніцамі гістарычных ведаў, прыцягнення ўвагі вучняў да гістарычнага факта, выпрацоўкі ў вучняў самастойнага навуковага падыходу к крыніцам гістарычных ведаў, фарміравання ўменняў аналізу, супастаўлення, параўнання гістарычных падзей, з’яў і г.д.

Акрамя фрагментаў гістарычных дакументаў, змешчаных у тэксце параграфа, вучням прапануецца дадатковы матэрыял у рубрыцы “Культурна-гістарычнае асяроддзе”. Яго змест прысвечаны лёсам двух удзельнікаў паўстання – даследчыка Сібіры І. Чэрскага і ганаровага грамадзяніна Грэцыі З. Мінейкі. Дадзены матэрыял пашырае гістарычны кругагляд вучняў, спрыяе рэалізацыі міжпрадметных сувязяў і фарміраванню пазнавальнага інтарэсу да вывучэння гісторыі.

У канцы параграфа з мэтай першаснага замацавання атрыманых ведаў аўтары прапаноўваюць скласці табліцу “Асноўныя палітычныя групоўкі ў паўстанні”, якая дасць магчымасць параўнаць мэты, склад удзельнікаў і тактыку іх дзеянняў і такім чынам сістэмна засвоіць змест гістарычнага матэрыялу па дадзенай тэме. Для развіцця крытычнага мыслення вучняў у канцы параграфа прадугледжаны пытанні на разважанне, што дае магчымасць настаўніку выслухаць розныя пункты гледжання і стварыць умовы для дыскусіі. Яе арганізацыя можа станоўча паўплываць на працэс засваення матэрыялу вучнямі і выявіць якасць яго разумення.

Такім чынам, прыведзеныя ў тэксце вучэбнага дапаможніка яркія прыклады барацьбы беларускага народа за сваю свабоду і раўнапраўе маюць значны патэнцыял для фарміравання патрыятычных пачуццяў і нацыянальнай самасвядомасці вучняў. Рашаючае значэнне ў дасягненне мэты выхавання патрыятызму, а таксама стварэнне неабходных умоў для развіцця ў вучняў крытычнага мыслення, уменняў аналізаваць і параўноўваць вывучаемыя гістарычныя падзеі можа можа аказаць вобразнае і эмацыянальнае выкладанне дадзенай тэмы настаўнікам. У сувязі з гэтым пры падрыхтоўцы да ўрока будзе мэтазгодна пазнаёміцца з метадычнымі рэкамендацыямі і магчымымі сцэнарыямі правядзення ўрока па дадзенай тэме [3, с. 94–105; 4, с. 67–71; 5, с. 102–111].

Літаратура і крыніцы

1. Марозава, С.В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст.: вучэб. дапам. для 9-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Марозава, У.А. Сосна, С.В. Паноў; пад рэд. У.А. Сосны. – 2-е выд., дап. і перагледж. – Мінск. : Выд. цэнтр БДУ, 2011. – 199 с.

2. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V–XI классы.– Минск: Нац. ин-т обр-я, 2012. – 96 с.

3. Корзюк, А. А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе: вучэб.-метад. дапаможнік / А. А. Корзюк; пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2011. – 152 с.

4. Корзюк, А.А. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII – пачатак XX ст.): 9-ы клас: дапам. для вучняў агульнаадук. устаноў з белар. і рус. мовамі навучання / А.А. Корзюк, С.В. Паноў. – Мінск: АСАР, 2010 – 122 с.

5. Корзюк, А.А. Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу пры вывучэнні гісторыі і грамадазнаўства / А.А. Корзюк, Н.А. Дзямідава. – Мінск: Мінск. абл. ІРА, 2012. – 117 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ